# Майстэрства радавацца жыццю

**Да 23 ліпеня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» можна убачыць выстаўку дыпломных работ выпускнікоў факультэта мастацкай культуры кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Творы, прадстаўленыя на суд шырокага гледача, выкананы ў 2023—2024 навучальным годзе.**



*Марыя Ткачова «Нямесячная ноч».*



*Дар'я Басько «Іншы свет».*

## Педагогіка, навука, творчасць

Кафедра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКіМ больш за дваццаць пяць гадоў паспяхова ажыццяўляе педагагічную, выхаваўчую і навукова-даследчую дзейнасць у галіне народнага мастацтва, падкрэсліваюць у галерэі. Яе выпускнікі займаюцца педагогікай, навукай і, натуральна, творчасцю. Іх прафесійныя абавязкі звязаны з захаваннем і развіццём традыцыйнага народнага мастацтва. Вядома, што кафедра супрацоўнічае з многімі вытворчымі, навуковымі і навучальнымі ўстановамі не толькі краіны, але і блізкага замежжа.

Штогод выпускнікі прэзентуюць работы ў розных відах і напрамках сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Сярод іх — кераміка, маляванка, ткацтва, габелен, батык, апплікацыя саломкай, дрэваапрацоўка. Любая работа, натуральна, — пад кіраўніцтвам выкладчыкаў, вопытных майстроў.

## Заняць розум

Сярод тэм, якія цікавяць моладзь, — беларускія традыцыі ды міфы, родныя карані і пошукі шляхоў у будучыню, нерэальны свет, зменлівасць, мімалётнасць часу і адначасова яго застыласць… І ўсё ж у многіх работах праглядаюцца матывы жыццярадаснасці, бадзёрасці, надзеі. Нехта абавязкова захоча дадаць: «І наіўнасці». Сапраўды, вартая тэма для дыскусіі — наіўныя шчасце, весялосць, захапленне ў спробах многіх маладых аўтараў. Наколькі іх прысутнасць у тым ці іншым творы жывапіснага, скульптурнага ці дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва апраўданая, які ўзровень іх наяўнасці дапушчальны і, увогуле, ці гатовы да іх патрабавальны, выхаваны на найдасканалейшых і надзвычай эпатажных узорах сусветнага сучаснага мастацтва глядач — пытанні, здатныя заняць розум. Адна з высноў, да якіх можна прыйсці, між іншым, дакладная і бясспрэчная — работы маладых не абавязаны валодаць выключнай глыбінёй і сур'ёзнасцю. Хаця б таму, што ім часам няма адкуль узяцца, хоць некаторыя, вядома, імкнуцца іх спарадзіць. І тады гэтыя штучнасць, нават фальшывасць, недарэчнасць збіваюць стваральнікаў з уласнага творчага шляху і адпуджваюць гледача, а ён не дарує падману.



*Кацярына Карповіч «Сонечны калейдаскоп».*

## Засвоеныя правілы

Між тым увага да наіўнасці ў творчасці маладых зусім не азначае, што яны працуюць ці ставяць за мэту развівацца ў кірунку таго ж інсітнага мастацтва, якое вылучаецца, напрыклад, ігнараваннем акадэмічных норм і выкарыстаннем яркіх і насычаных фарбаў. Прынамсі, па выстаўцы дыпломных работ выпускнікоў факультэта мастацкай культуры кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў гэтага вызначыць немагчыма — усяго па пары твораў ад аўтара. Тут часцей наадварот — многія мастакі, натуральна, імкнуліся прадэманстраваць тое, што засвоілі, тое, на што здольны тыповы майстар. Тым не менш, тэмы, матывы, вобразы іх твораў даюць магчымасць зразумець, чым жывуць маладыя творцы, і галоўнае — пачуць іх унутраны дыялог з самім сабой.



*Дарыя Арлова «Мімалётнасць».*

**Яўгенія ШЫЦЬКА,**
**фота аўтара**